


# Гродзенскі ўніверсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● № 3 (254) ● 2 красавіка 1998 года, чацвер

Выходзіць адзін раз у месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


## ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ - 20 ГАДОЎ

## ДЫЯЛОГ АТРЫМАЎСЯ

20 сакавіка ў актавай зале вучэбнага корпуса па вуліцы Леніна адбылася сустрэча студэнтаў з прадстаўнікамі адміністрацыі ГрДУ. На сустрэчу прыйшлі рэктар універсітэта прафесар С.А.Маскевіч, прарэктар па навуковай працы дацэнт В.В.Сянько, прарэктар па гаспадарчай рабоце К.В.Ярмак, галоўны бухгалтар Т.А.Герашчанка, загадчык навучальнага аддзела Л.У. Бярэйшык, старшыня прафкама студэнтаў А.А.Грынь.

Амаль за тыдзень да сустрэчы студэнты маглі апусціць у скрынку ў пісьмовым выглядзе свае пытанні. А іх было шмат, самых разнастайных па тэматыцы. Да асобнай групы можна аднесці пытанні, якія былі адрасаваны асабіста рэктару:

- Хто Ваш ідэал?
- Хто, на Ваш погляд, з'яўляецца культурным чалавекам?
- Што б Вы змянілі ў сваім жыцці, калі б маглі?
- Што робіце, сустракаючыся са злом?

На гэтыя пытанні членаў клуба цікавых сустрэч філалагічнага факультэта рэктар універсітэта адказваў лаканічна, канкрэтна, і такім чынам уважлівы наглядальнік мог скласці з гэтых адказаў-штрыхоў абрысы партрэта сучаснага кіраўніка вну, навукоўца, грамадзяніна. Застаецца дадаць, што партрэт гэты атрымаўся ў светлых, прыемных фарбах.

Наступная група пытанняў - аб набалелым - вучобе, раскладзе заняткаў, экзаменах. Адказвала на гэтыя


*(Заканчэнне на 3-й стар.).*


## У НАШЫМ ДОМЕ — ЮБІЛЕЙ

**Спаўняецца 20 гадоў з часу пераўтварэння педінстытута ва універсітэт. Як гэта адбылося? Якая работа папярэднічала такому пераўтварэнню? Вядома ж, сведкі і ўдзельнікі тых, ужо далёкіх сёння падзей, і цяпер жывуць і працуюць побач, і, вядома, ахвотна падзеляцца ўспамінамі з чытачамі нашай газеты, раскажуць, як выраслі універсітэт, канкрэтны факультэт, канкрэтны чалавек.**

**У абласным архіве захоўваецца копія пастановы Савета Міністраў СССР ад 24 чэрвеня 1977г. за N 564 аб арганізацыі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта.**

**Вось што напісана ў гэтым гістарычным дакуменце:**

**"Совет Министров СССР постановляет принять предложение ЦК Компартии Белоруссии и Совета Министров Белорусской ССР, согласованное с Министерством высшего и среднего образования СССР и Министерством просвещения СССР, об организации в 1978 году в городе Гродно Гродненского государственного университета Министерства высшего и среднего образования Белорусской ССР на базе Гродненского государственного педагогического института имени Янки Купалы".**

**І вось ужо два дзесяткі гадоў універсітэт, які з'яўляецца цэнтрам адукацыі і навукі ў рэгіёне, рыхтуе кадры для школ, дзяржустаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, і не толькі для Гродзенскай вобласці.**

**У нашага універсітэта багатая гісторыя. Але сёння больш цікавіць заўтрашні дзень, перспектывы развіцця. Таму рэдакцыя газеты, ідучы насустрач пажаданням чытачоў, пачынае юбілейную рубрыку з матэрыялаў аб набытках і перспектывах развіцця універсітэта (стар.4-5).**

## ЦИТАТА НОМЕРА:

***"НЕ НУЖНО ДОКАЗЫВАТЬ, ЧТО ОБРАЗОВАНИЕ - САМОЕ ВЕЛИКОЕ БЛАГО ДЛЯ ЧЕЛОВЕКА. БЕЗ ОБРАЗОВАНИЯ ЛЮДИ И ГРУБЫ, И БЕДНЫ, И НЕСЧАСТНЫ".***

***Н.Г. ЧЕРНЫШЕВСКИЙ.***

## З УЗНАГАРОДАЙ!

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь N 64 ад 5 лютага 1998 года за значны асабісты ўклад у развіццё і памнажэнне інтэлектуальнага патэнцыялу ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджаны кандыдат юрыдычных навук, прафесар кафедры крымінальнага права, працэсу і крыміналістыкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы **Васіль Цімафеевіч КАЛМЫКОЎ.**

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

***НАГАДВАЕМ, КАЛІ І КАГО МОЖНА ПАВІНШАВАЦЬ З ЮБІЛЕЕМ.***

* 10 красавіка - ***Веніяміна Мікітавіча ТУМАНАВА*** - дацэнта кафедры біяхіміі і біятэхналогіі;

* 12 красавіка - ***Сяргея Уладзіміравіча КЛІМАНСКАГА*** - дацэнта кафедры беларускай літаратуры;

* 12 красавіка ***Людмілу Фёдараўну СІДОРСКУЮ*** - інжынера ІІ катэгорыі навуковага аддзела.

## *Віншуем*

з днём нараджэння **Яўгенію Лукінічну БАЛІЦКУЮ** і **Аляксандра Мікалаевіча ПАТАПАВА.** Жадаем моцнага здароўя, шчасця, даўгалецця.

**Савет ветэранаў.**

АФІЦЫЙНА

## САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА

На пасяджэнні Савета універсітэта ў лютым разглядаліся наступныя пытанні:

аб удасканаленні арганізацыі навучальнага працэсу ва універсітэце, справаздача аб выкананні каштарысу расходаў універсітэта за 1997 год.

Пачалося пасяджэнне, як заўсёды, з выбрання па конкурсу. Затым з інфармацыяй аб удасканаленні арганізацыі навучальнага працэсу ва універсітэце выступіла начальнік навучальнага аддзела Л.У. Бярэйшык.

Навучальны план з'яўляецца асноўным дакументам у арганізацыі навучальнага працэсу ва універсітэце. Як ён рэалізуецца? Аб гэтым і гаварыла дакладчыца. У асноўным работа ў гэтым напрамку вядзецца планамерна і мэтанакіравана. Ёсць, вядома, і пытанні, на якія патрэбна звярнуць больш пільную ўвагу. Члены Савета прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні гэтага пытання.

Са справаздачай аб выкананні каштарысу расходаў у 1997 годзе выступіла галоўны бухгалтар універсітэта Т.А.Герашчанка.

У раздзеле "рознае" былі разгледжаны найбольш надзённыя пытанні.

## АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

На пасяджэнні рэктарата ад 9 сакавіка было заслухана пытанне аб стане выхаваўчай работы ў інтэрнатах. З інфармацыяй выступіў загадчык аддзела выхавання Г.М. Кабяк.

- Тыя рашучыя меры, якія былі прыняты па навядзенні парадку, -сказаў дакладчык, - прынеслі станоўчыя вынікі. Парушальнікі дысцыпліны адлічаны з ліку студэнтаў і выселены з інтэрнатаў. Сур'ёзныя парушэнні дысцыпліны былі заўважаны ў інтэрнаце N 2. Цяпер устаноўлены графік наведвання інтэрната выкладчыкамі тых факультэтаў, студэнты якіх тут пражываюць - юрыдычнага, гісторыі і культуры, біялогіі і экалогіі. Гэта станоўча адбіваецца на агульнай атмасферы інтэрнацкага жыцця.

У гэтым жа інтэрнаце, як паведаміў дакладчык, і санітарны стан горшы, чым у іншых. Але справы наладжваюцца. Так, у параўнанні з мінулым годам - і гэта адзначылі члены рэктарата, - санітарны стан у інтэрнатах NN 2 - 4 палепшыўся, больш трывалым стаў у іх унутраны распарадак. Гэта стала магчымым дзякуючы мэтанакіраваным намаганням адміністрацыі універсітэта, інтэрнатаў, дэканатаў факультэтаў. Аднак шмат яшчэ трэба зрабіць у плане выхаваўчай работы, паляпшэння санітарнага стану, эстэтычнага афармлення інтэрнатаў.

# У XXI ВЕК — З ПАДНЯТАЙ ГАЛАВОЙ

### НАТАТКІ З ПАШЫРАНАГА ПАСЯДЖЭННЯ САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА З УДЗЕЛАМ МІНІСТРА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ В.І. СТРАЖАВА

6 сакавіка наш універсітэт наведаў міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь В.І.Стражаў. Адбылося пашыранае пасяджэнне Савета універсітэта з удзелам міністра. З інфармацыяй "Асноўныя кірункі развіцця Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы" выступіў рэктар універсітэта прафесар С.А. Маскевіч.

У дакладзе, які суправаджаўся паказам слайдаў з дыяграмамі і параўнальнымі лічбамі, гаварылася як у цэлым аб універсітэце, якому, дарэчы, сёлета спаўняецца 20 гадоў, так і аб прыярытэтных напрамках дзейнасці, канцэптуальных ідэях, матэрыяльнай базе і многім іншым, што з'яўляецца неад'емнай часткай развіцця універсітэта. Дарэчы, па просьбах чытачоў мы публікуем у пераказе даклад рэктара С.А.Маскевіча ў сённяшнім нумары газеты "Гродзенскі універсітэт".

Затым пачалося абмеркаванне даклада. Актыўна выступалі члены савета. Кожны уносіў цікавыя прапановы ці гаварыў аб тым, што набалела, дзяліўся думкамі наконт будучыні нашага універсітэта. Забягаючы наперад, хочацца адзначыць, што такое жывое абмеркаванне спадабалася міністру, і ён пачаў сваё выступленне менавіта з таго, што выказаў прыемнае здзіўленне наконт актыўнасці членаў Савета. А выступалі прадстаўнікі амаль кожнага факультэта - дэканы факультэтаў педагогікі і псіхалогіі і фізіка-тэхнічнага В.П. Таранцей і Г.А. Гачко, старшыня прафкама выкладчыкаў і супрацоўнікаў У.А. Хілюта, дэканы факультэтаў гісторыі і культуры, фізічнай культуры І.П. Крэнь і У.М. Карчэўскі і іншыя.

Міністр адукацыі В.І. Стражаў у сваім выступленні спыніўся больш падрабязна на праблемах адукацыі. Ён коратка расказаў аб сустрэчы Прэзідэнта РБ з рэктарамі, на якой быў падпісаны пратакол даручэнняў. Распрацавана канцэпцыя вышэйшай адукацыі рэспублікі. Што патрэбна рабіць і як - яснасць ёсць - прыкладна так выказаў сваю думку міністр наконт далейшага развіцця вышэйшай школы.

Ён спыніўся на развіцці класічных універсітэтаў у рэгіёнах - а менавіта да такіх і належыць ГрДУ. Для рэспублікі такія універсітэты маюць вялікае значэнне. Яны ўплываюць на духоўны патэнцыял рэспублікі.

В.І. Стражаў адзначыў таксама, што патрэбна ісці на стварэнне вышэйшых каледжаў пры універсітэтах. Такі шлях беспамылковы. І, наогул, мы можам ганарыцца ўзроўнем адукацыі ў рэспубліцы, бо ідзем нарадзе многіх еўрапейскіх краін. А ўзровень адукацыі дазваляе ўступаць у XXI век з паднятай галавой. Тая ж адукацыя дасць магчымасць у бліжэйшыя дзесяцігоддзі ўзняць і ўзровень жыцця.

## ДЫЯЛОГ АТРЫМАЎСЯ

(Пачатак на 1-й стар.).

пытанні ў асноўным загадчык навучальнага аддзела Л.У. Бярэйшык. Былі пытанні і да прарэктара па навуковай працы В.В. Сянько. У галоўнага бухгалтара Т.А. Герашчанка студэнты пыталіся, куды ідуць грошы, чаму такія, а не іншыя памеры стыпендыі і г.д.

Асабліва шмат пытанняў датычылі быту студэнтаў. Гэта і парадак у інтэрнатах, і харчаванне ў студэнцкіх сталоўках, і адпачынак. Прарэктар па гаспадарчай працы К.В. Ярмак адказаў на большасць з іх, а нейкая частка пытанняў дапаможа ў далейшай рабоце асобным службам універсітэта.

Можна назваць агульную рысу гэтага дыялогу. Гэта, у першую чаргу, тое, што студэнтаў хвалюе не толькі сённяшні дзень, надзённыя праблемы. Многія пытанні закранаюць дзень заўтрашні, будучыню, перспектывы маладога спецыяліста. І гэта радуе: у аўдыторыях сёння - не толькі выканаўцы, але і творцы.

Дыялог адбыўся добры, адчуваўся ўзаемны давер. Гэта была першая такая сустрэча. І яна атрымалася. Удзельнікі дыялогу з абодвух бакоў засталіся задаволеныя: студэнты - тым, што адказалі на іх пытанні, кіраўніцтва - тым, што больш даведалася пра тое, чым і як жыве моладзь, што хвалюе студэнцтва напрыканцы дваццатага стагоддзя.

## ЗАЎТРА ПАЧЫНАЕЦЦА СЁННЯ



**На фізіка-тэхнічны факультэт прыходзяць у асноўным тыя, хто мае імкненне і здольнасці да гэтай складанай навукі. Сярод іх - і Мікалай Серабракоў. З вялікай цікавасцю Мікалай вывучыў камп'ютар, асвоіў работу на ім. Вельмі любіць практычныя заняткі ў лабараторыі, заўсёды спраўляецца з заданнямі.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнт 5 курса фізіка-тэхнічнага факультэта Мікалай Серабракоў.**

**Фота Ул. САРОКІНА.**

### Заметки с практики

# ПУШКИН В ГИМНАЗИИ

**Л. ДОРОШ,**
**студентка 5 курса филологического факультета ГрГУ им. Янки Купалы**

Педагогическая практика - это, во-первых, прекрасная возможность для студента проверить, правильно ли он выбрал профессию, не ошибся ли, во-вторых, возможность пополнить свои знания, расширить кругозор. Во время практики на многие вещи начинаешь смотреть по-новому, открываешь для себя много интересного.

Так получилось, что А.С. Пушкин не стал моим любимым поэтом в школе, раньше я не могла понять, почему его называют величайшим и гениальнейшим во всей русской литературе.

А.С. Пушкин "открывался" для меня постепенно. Это было удивительное открытие. Поначалу - просто наслаждение красотой слога, простотой и задушевностью, восхищение его героями. Затем - более внимательное, вдумчивое чтение, осознание того, что А.С. Пушкин действительно сделал очень многое для русской литературы. Становилось понятным, почему так трепетно относились к нему Борис Пастернак и Марина Цветаева, почему так любил его Ф.М. Достоевский. А.С. Пушкин стал для меня воплощением гармонии: гармонией живут его произведения, гармоничен сам А.С. Пушкин.

В гимназии на практике я вновь "столкнулась" с А.С. Пушкиным. И именно практика помогла мне открыть еще одну важную сторону творчества этого замечательного русского поэта.

Готовясь к урокам, посвященным творчеству А.С. Пушкина, я читала немало книг, но среди них особенно мне понравилась и запомнилась книга В.С. Непомнящего "Поэзия и судьба". Именно благодаря ей, а также циклу телепередач об А.С. Пушкине, ведущим которых был тот же В.С. Непомнящий, я "открыла" еще одну "загадку" русского поэта. Долгое время имя А.С. Пушкина было тесно связано с именами декабристов; в поэте видели лишь певца свободы, восставшего против классовой несправедливости, царской власти, порабощения одних людей другими. В произведениях А.С. Пушкина выделяли (часто искусственно) лишь политическую, социальную проблематику, оставляя без должного внимания проблематику общечеловеческую. В.С. Непомнящий был одним из первых, кто заговорил о нравственной проблематике произведений А.С. Пушкина и поставил ее в творчестве поэта на первое место. Помоему, каждому учителю литературы это знать просто необходимо. И вот почему. Литература - один из немногих предметов, который выполняет главную функцию школы вообще - воспитание ребят, а обращение их к нравственной, общечеловеческой проблематике помогает осуществить эту задачу: ребята начинают задумываться над тем, что есть истина, что есть добро и зло, приходят к осознанию того, каким должен быть по-настоящему красивый человек. Практика в гимназии показала и доказала, насколько действенным может быть такой подход.

Свои уроки, посвященные А.С. Пушкину, я старалась строить, привлекая материалы книги Непомнящего. Не всегда все получалось так, как хотелось бы, но, тем не менее, результат был удивительным: А.С. Пушкин "оживал" на уроках литературы, он был рядом, заставляя нас думать и рассуждать. По-новому были прочитаны ода "Вольность" и стихотворение "Анчар". "Анчар" традиционно относили к вольнолюбивой лирике, ребята же открыли в нем нечто иное. Тема свободы была "отодвинута" на задний план, ее место заняла проблема зла.

По-иному предстал А.С. Пушкин и как личность. Он стал для ребят не только веселым человеком, любящим жизнь, но и человеком чести, может быть, даже строгим судьей, говорящим своими произведениями, какими мы должны быть сегодня. Для Пушкина нравственный закон выше любого другого закона на земле. И мы поняли смысл известных слов о том, что, читая одного А.С. Пушкина, можно превосходным образом воспитать в себе человека.

## ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ - 20 ГАДОЎ

# ПАТЭНЦЫЯЛ БУДЗЕ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЦА ПОЎНАСЦЮ

**По матэрыялах даклада рэктара ГрДУ прафесара С.А. МАСКЕВІЧА на Савеце універсітэта 6 сакавіка 1998 года**

### АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ

Эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь у цэлым і ў прыватнасці Гродзенскай вобласці перажывае працэс пераходу да сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі.

Асаблівасцю эканамічнага развіцця Гродзенскага рэгіёна з'яўляецца яго памежнае месцазнаходжанне, развітыя хімічная прамысловасць і аграпрамысловы сектар эканомікі. З вялікай верагоднасцю можна прагназаваць далейшае развіццё такіх галінаў рэгіянальнай эканомікі, як хімічная, харчовая і лёгкая прамысловасць, а таксама ўсіх відаў адміністрацыйнай, кантрольнай і прадпрымальніцкай дзейнасці, звязаных з транзітам ґрузаў з усходу на захад і наадварот.

**Ва універсітэце дзейнічаюць дзевяць факультэтаў. Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па 28 спецыяльнасцях па трох формах навучання: дзённай, вячэрняй, завочнай на бюджэтнай і дагаворнай аснове.**

Працэсы рэструктурызацыі і прыватызацыі прадпрыемстваў стымулююць патрэбнасць у эканамістах і мэнэджэрах, у спецыялістах для мясцовых органаў улады, здольных забяспечыць нармальную рэалізацыю рэформаў у краіне.

Вобласць адчувае пастаянную патрэбнасць у педагагічных кадрах для ўсёй сістэмы бесперапыннай адукацыі - ад пачатковай школы да інстытутаў курсаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў.

Універсітэт быў і застаецца буйной і аўтарытэтнай навучальнай і навуковай установай, здольнай вызначаць адукацыйную палітыку рэгіёна, задавальняючы яго патрэбнасці ў падрыхтоўцы кадраў для прамысловасці і арганізацый, забеспячэння адукацыйнага працэсу ўсіх узроўняў. Універсітэт мае намер здзяйсняць свае стратэгічныя планы з улікам эканамічнай сітуацыі ў краіне і рэгіёне, абапіраючыся на свае моцныя бакі і перавагу.

Калі гаварыць канкрэтна, то гэта, у першую чаргу, тое, што універсітэт займае цэнтральнае месца ў рэгіянальнай адукацыі, навуцы і культуры за кошт сваёй шматпрофільнасці, мае патэнцыял для фармавання новых курсаў і спецыяльнасцяў. Універсітэт мае трывалыя педагагічныя і даследчыя традыцыі, актыўныя сувязі з установамі дауніверсітэцкай адукацыі, развітыя міжнародныя і памежныя сувязі, сучасныя інфармацыйна-тэхналагічныя рэсурсы.

### РЭГІЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР АДУКАЦЫІ

Высакародную місію выконвае універсітэт у рэгіёне. Ён забяспечвае вышэйшую адукацыю і ґрунтоўную падрыхтоўку спецыялістаў-прафесіяналаў, неабходных грамадству сёння і ў перспектыве, здольных гнутка адаптавацца да змяняючагася асяроддзя і ўплываць на сацыяльнае і тэхналагічнае развіццё грамадства. Універсітэт нацэлены на задавальненне культурных і духоўных патрабаванняў, якія звязаны з адукацыяй і самаадукацыяй, рэалізацыяй унутранага патэнцыялу асобы.

**Агульная колькасць студэнтаў у 1997-1998 навучальным годзе складае 8261, з іх на дагаворнай аснове - 2679, дзённай - 5260, вячэрняй 86 і завочнай форме навучання - 2915 студэнтаў.**

Універсітэт імкнецца стаць рэгіянальным цэнтрам адукацыі, навукі і культуры і дасягнуць высокага ўзроўню як выкладання, так і навукі, разумеючы, што абодва кірункі дзейнасці ўзаемазалежныя.

Чалавечыя, фізічныя і тэхналагічныя рэсурсы універсітэт накіроўвае на служ- бу грамадскаму прагрэсу і імкнецца да павышэння ўзроўню жыцця і сацыяльнай абароны сваіх супрацоўнікаў.

### ШЛЯХІ ВЫЗНАЧАНЫ

Асноўныя кірункі развіцця універсітэта абапіраюцца на такія канцэптуальныя ідэі, як бесперапыннасць адукацыі, фундаменталізацыя адукацыі, навукі і выхавання, рэалізацыя навучальна-даследчага прынцыпу ў адукацыі, шматузроўневасць адукацыі, гуманізацыя і гуманітарызацыя адукацыі, улік і ўзгадненне інтарэсаў асобы і грамадства, улік рэгіянальных асаблівасцяў у адукацыйнай палітыцы універсітэта.

**Штогод больш як 250 выпускнікоў гімназій, ліцэяў і ліцэйных класаў пры ГрДУ становяцца абітурыентамі універсітэта.**

Асноўныя кірункі развіцця - а іх налічваецца сем - патрабуюць больш падрабязнага разгляду. Напрыклад, аптымізацыя структуры спецыяльнасцяў і спецыялізацый з улікам дзяржаўнага заказу і тых патрэбнасцяў, якія існуюць у рэгіёне. Спектр спецыяльнасцяў і спецыялізацый, аб'ём набору вызначаецца, зыходзячы з дзяржзаказу на рынку працы і конкурснай сітуацыі, з аднаго боку, і магчымасцяў універсітэта, з другога. Аптымізацыя структур спецыяльнасцяў можа прадугледжваць магчымасць змянення іх пераліку і адкрыццё спецыяльнасцяў з улікам рэгіянальнай спецыфікі, уласцівых толькі нашаму універсітэту.

З пункту гледжання дзяржзаказу на сёння ў рэспубліцы добра адладжана сістэма для педагагічных спецыяльнасцяў. Таму выключна актуальна стаіць пытанне распрацоўкі сваёй праграмы маркетынгавых даследаванняў. Калі зыходзіць з колькасці студэнтаў па групах спецыяльнасцяў у Рэспубліцы Беларусь і прэстыжу спецыяльнасцяў, то нам неабходна больш увагі надаваць умацаванню і развіццю эканамічных і тэхнічных спецыяльнасцяў.

# ПАТЭНЦЫЯЛ БУДЗЕ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЦА ПОЎНАСЦЮ

**Універсітэт рыхтуе спецыялістаў па наступных групах: гуманітарныя спецыяльнасці - 4018, у тым ліку правазнаўства - 1809, навуковыя спецыяльнасці - 1556, педагагічныя - 2025, тэхнічныя - 203, эканамічныя спецыяльнасці - 459.**

Для выканання дзяржзаказу на шэраг педагагічных спецыяльнасцяў нам не абыйсціся без узаемадзеяння з педвучылішчамі і структурнай рэарганізацыі факультэта псіхалогіі і педагогікі. Магчымасці забеспячэння універсітэтам новых спецыяльнасцяў і спецыялізацый не павінны абмяжоўвацца патэнцыялам толькі самога універсітэта: неабходны пошукі вну - партнёраў - у Беларусі, краінах СНД, далёкім замежжы - і рэалізацыя сумесных адукацыйных праграм, фармаванне сумесных цэнтраў дыстанцыйнай адукацыі; у тым ліку з выкарыстаннем навейшых інфармацыйных тэхналогій.

Аптымізацыя структуры прыярытэтных кірункаў навуковых даследаванняў у адпаведнасці з профілем падрыхтоўкі спецыялістаў і патрэбнасцяў рэспублікі і рэгіёна прадугледжвае падтрымку існуючых навуковых школ у галіне юрыдычных, псіхолага-педагагічных, філалагічных, фізіка-матэматычных і тэхнічных навук, развіццё ўзнікаючых навуковых школ у галіне гістарычных навук і культуралогіі, філалагічных навук, біялагічных, філасофскіх навук, работу па падрыхтоўцы і стварэнню навуковых школ у галіне эканамічных і хімічных навук, стымуляванне стварэння навуковых калектываў, перш за ўсё ў рамках міжуніверсітэцкіх рэспубліканскіх і міжнародных праграм, для правядзення даследаванняў у прыярытэтных галінах грунтоўных і прыкладных ведаў, ініцыяванне рэгіянальных навуковых праграм з удзелам акадэмічнай навукі і буйных спецыялістаў-практыкаў, стварэнне новых формаў і рэгіянальных структур для развіцця інавацыйнай дзейнасці за кошт інтэграцыі з вытворчасцю, іншымі вну і акадэмічнымі ўстановамі.

## ГАЛОЎНАЕ - ЯКАСЦЬ

Павышэнне навукова-педагагічнага патэнцыялу універсітэта прадугледжвае паляпшэнне якасных паказчыкаў функцыянавання існуючых інстытутаў падрыхтоўкі спецыялістаў і развіццё новых, у тым ліку развіццё форм падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Гэта, перш за ўсё, магістратура (падрыхтоўка магістрантаў па новых перспектыўных спецыяльнасцях, вылучэнне спецыяльных грантаў для падрыхтоўкі доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, стварэнне інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, стварэнне разам з абласным упраўленнем адукацыі праграм падтрымкі таленавітых дзяцей і моладзі. Павінна рабіцца стаўка і на павышэнне матывацыі студэнтаў універсітэта ў атрыманні ведаў, у тым ліку за кошт стварэння канкурэнцыі паміж студэнтамі бюджэтнай і дагаворнай формы навучання, паступовы пераход да самастойнай работы студэнтаў.

**Ва універсітэце працуюць 1207 выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Прафесарска-выкладчыцкі састаў 58 кафедр універсітэта складаюць 580 штатных супрацоўнікаў і 110 сумяшчальнікаў, з іх 33 доктары навук, 241 - кандыдат, 1 акадэмік НАН, 36 прафесараў, 167 дацэнтаў. Вядзецца падрыхтоўка 18 магістрантаў, 130 аспірантаў, 112 спашукальнікаў і 5 дактарантаў.**

На галоўную задачу - падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў працуе бібліятэка універсітэта. Яна развіваецца з кожным годам, як і ўся інфармацыйная інфраструктура універсітэта. У гэтым кірунку найбольш важным з'яўляецца стварэнне сучаснай бібліятэкі з улікам кірункаў навуковай і педагагічнай дзейнасці, вызначэнне ролі і месца ў адзінай інфармацыйнай адукацыйнай прасторы Рэспублікі, укараненне інфармацыйных тэхналогій у працэс навучання і навуковых даследаванняў, асабліва на факультэтах неспецыяльнага профілю, фармаванне электронных базаў дадзеных і арганізацыя доступу да іх, распрацоўка электронных падручнікаў, базаў дадзеных, курсаў для дыстанцыйнага навучання, арганізацыя эфектыўнай сістэмы доступу да сусветнай інфармацыі.

**Універсітэт мае навучальнае і навуковае абсталяванне на суму 28,1 мільярда рублёў, у тым ліку 307 персанальных камп'ютараў, улічваючы 10 камп'ютарных класаў. Бібліятэчны фонд складае каля 600 тыс. тамоў.**

Для рэалізацыі мэтаў і задач універсітэта ў 1998 годзе мяркуецца распрацаваць маркетынгавую праграму універсітэта, комплексную праграму выхаваўчай работы са студэнтамі, праграму сацыяльнай падтрымкі супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта, праграму ўкаранення інфармацыйных тэхналогій, праграму развіцця матэрыяльнай базы, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, развіцця пазабюджэтнай дзейнасці універсітэта, праграму даследчай падрыхтоўкі спецыялістаў ва універсітэце, гуманітарызацыі і гуманізацыі вышэйшай адукацыі, праграму па стварэнні сучаснай інфраструктуры памежнага супрацоўніцтва і інтэграцыйных сувязяў у рэгіёне.

## САЦЫЯЛЬНАЯ ПРАГРАМА

Распрацавана і прынята праграма "Жыллё", накіраваная на паляпшэнне жыллёвых умоў выкладчыкаў універсітэта. У рамках гэтай праграмы выдзелена 3,6 мільярда рублёў на набыццё кватэр. Гэта сродкі, зробленыя універсітэтам. Праграма "Жыллё" прадугледжвае забеспячэнне кватэрамі прыкладна 8 чалавек у год.

**Універсітэт размяшчаецца ў 8 памяшканнях агульнай плошчай больш як 28 тыс. квадратных метраў, дадаткова арэндуецца 2070 квадратных метраў плошчы.**

У плане сацыяльнай праграмы міністэрства дапамагло атрымаць грошы на перапраектаванне інтэрната на Дзевятоўцы. Там будуць і кватэры, і студэнцкія месцы ў выглядзе аднапакаёвых кватэр. Забеспячэнне жыллём - адна з асноўных праблем, якую неабходна вырашаць, каб мець маладыя кадры, узброеныя сучаснымі ведамі.

# ЛЕПШЫЯ КАМАНДЫ

З 9 сакавіка, тры вечары запар, праходзіў конкурс каманд КВЗ. Кожны факультэт падрыхтаваў сваю праграму. Удзельнічалі ў конкурсе дзевяць каманд. Агульнае ўражанне ў журы конкурса склалася нядрэннае. Але былі і заўвагі. Калі тэксты выступленняў у асноўным былі добрыя, то не хапала пастановачнай часткі, апрацоўкі.

У фінал выйшлі каманды факультэтаў біялогіі і экалогіі, фізіка-тэхнічнага, філалагічнага. Пераможцам конкурсу ўручаны памятныя прызы.

СПОРТ

# ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ПЕРАМОЖЦЫ

У праграме спартакіяды, якая праходзіць ва універсітэце, 16 відаў спорту. Не будзем сёння пералічваць усе, скажам толькі, што па дзесяці відах спаборніцтвы ўжо закончыліся.

Цікава прайшоў тур першынства універсітэта па баскетболу сярод мужчын, у якім прымалі ўдзел 8 факультэцкіх каманд. Каманды былі размеркаваны на падгрупы. У фінале сустрэчы прайшлі стыкавыя гульні па перакрыжаванай сістэме.

Чэмпіёнам універсітэта стала каманда факультэта эканомікі і кіравання. На другім месцы - каманда фізіка-тэхнічнага факультэта, затым - каманды баскетбалістаў з факультэтаў гісторыі і культуры і юрыдычнага.

Прайшлі спаборніцтвы па валейболу сярод мужчын і жанчын. Наперадзе - лёгкая атлетыка, вясновы крос, шахматы.



**Фізіка - навука не толькі складаная, але і цікавая. Асабліва калі прыходзіць час практычных заняткаў у лабараторыі. Для студэнтаў чацвёртага курса чацвёртай групы фізіка-тэхнічнага факультэта такі час настаў. Заняткі, якія праводзіць старшы выкладчык кафедры прыкладной оптыкі Яўгеній Васільевіч Кудраўкін па курсу "Аптычныя вымярэнні", запамінаюцца. Ёсць магчымасць самастойнай работы, і ў той жа час выкладчык заўсёды побач.**

**НА ЗДЫМКУ: ідуць практычныя заняткі ў лабараторыі.**

**Фота Ул. САРОКІНА.**

УВАГА: КОНКУРС

# ДЛЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ РАБОТЫ

Аб'яўлены конкурс праектаў (прапаноў), накіраваных на ўдасканаленне работы бібліятэкі універсітэта. Мэта яго -вызначэнне першачарговых мер, накіраваных на забеспячэнне больш эфектыўнай работы бібліятэкі універсітэта. Узначальвае экспертную камісію прарэктар па навучальнай рабоце Л.В. Рычкова. У складзе камісіі - 6 чалавек.

Распрацаваны меры заахвочвання пераможцаў конкурсу ў памеры 25 мінімальных заработных плат. Першая прэмія - 10 "мінімалак", другая - 6, трэцяя - 4 мінімальныя заработныя платы. Прадугледжана пяць заахвочвальных прызоў коштам да адной мінімальнай заработнай платы.

Праекты (прапановы) могуць быць накіраваны на ўдасканаленне работы бібліятэкі ў цэлым, яе асобных напрамкаў -бібліятэка - факультэт; бібліятэка - кафедра; камплектаванне кніжнага і электроннага фонду; удасканаленне даведачнага апарату; стварэнне лакальнай унутрыбібліятэчнай сеткі; падрыхтоўка і выданне бібліяграфічных указальнікаў, спісаў літаратуры; арганізацыя выдачы вучэбнай літаратуры; работа чытальнай залы і абанемента навуковай літаратуры; работы факультэцкіх бібліятэк.

У конкурсе могуць удзельнічаць як асобныя людзі, так і любыя творчыя групы. Кожны праект падаецца пад дэвізам і разглядаецца экспертнай камісіяй без указання дадзеных аб распрацоўшчыках. Матэрыялы, прадстаўленыя на разгляд, павінны ўтрымліваць: тлумачальную запіску, мэту праекта, спосабы яго ажыццяўлення, канчатковы вынік.

Экспертная камісія працуе да 30 красавіка бягучага года. Спяшайцеся!

# *ИЗ ВОЛГОГРАДА - СО ЩИТОМ*

**В.СЕЛИЦКИЙ,**
**художественный руководитель молодежного театра юмора "Канкан", выпускник ГрГУ**

Известная русская пословица гласит: "Лучше один раз увидеть, чем сто раз услышать". А увидев, громко заявить о себе. Все это в полной мере относится к молодежному театру юмора "Канкан", состоящему из студентов и выпускников нашего университета. Двухлетние усилия ребят, стремившихся попасть на престижный международный фестиваль в г. Волгограде, наконец-то увенчались успехом. И, в первый раз попав на столь представительный фестиваль (в нем, кроме "Канкана", принимало участие 11 команд из Волгограда, Самары, Тюмени, Днепропетровска, Иошкар-Олы, Рязани, Твери, Новочеркасска), ребята отнюдь не стали "мальчиками для битья". В первый же день "визитка" гродненцев была признана лучшей, и ребята, сорвав гром аплодисментов, стали любимцами волгоградской публики. Замечательно отработав конкурсную программу, все с нетерпением ждали последнего дня фестиваля, когда должна была наступить раздача "слонов", т.е. призов. И тут целая "гора" этих самых "слонов" обрушилась на "Канкан". Три приза за актерские работы, приз за "лучшую мужскую роль второго плана", приз за лучшие тексты и, наконец, самое главное - приз "Лауреата XV юбилейного фестиваля "Земля - планета людей" в г. Волгограде.

Итак, путешествие из Гродно в Волгоград и обратно завершилось для ребят из "Канкана" триумфально. Поздравляем!

# "Наднёманскія галасы"

**Здаецца, што самае прыемнае для любога пачынальніка-наватара - упэўненасць, што па адкрытаму ім шляху будуць ісці новыя людзі. Не хачу прыпісваць сабе нейкую наватарскую справу, але тым не менш і мне прыемна адзначыць, што ў шэрагах маладых творцаў паболела новых імён. Пры знаёмстве з новым чалавекам не магу не адзначыць, што кожны з іх нясе з сабой нейкі арэол загадкавасці, нязвычнасці.**

**Але адна справа, калі прыходзяць нясмелыя юнакі ці дзяўчаты са спісаным дрыготкім ад хвалявання почыркам сшыткам вершаў. Другое зусім адчуванне, калі гэты новы чалавек ужо і не студэнт, ужо і не юнак, а сшытак, як і ў тых, маладых, выдае яго ўсхваляваны душэўны стан. Прызнацца, узнікае натуральнае пытанне, што стала штуршком для чалавека, калі ён пачаў пісаць.**

**Руслан Казлоўскі - не толькі малады творца, ён малады выкладчык кафедры беларускай літаратуры, ён яшчэ аспірант. Сам прызнаецца, што пісаць пачаў даўно, але вось прапанаваць творы чытачу асмеліўся не адразу. Натхніла творчасць студэнтаў. Вось так і прыгадалася мне недзе чутае параўнанне: што такое алмаз? Каляровы каменьчык, які становіцца брыліянтам толькі пад уздзеяннем другога алмаза. Чалавека можна параўнаць з алмазам: ён пачынае зіхацець, як брыліянт, у кантакце з іншымі людзьмі, калі раскрываюцца яго лепшыя рысы.**

**Я думаю, плён творчасці нашых маладых пісьменнікаў натхніць і іншых пачаткоўцаў. Будзем чакаць іх зорнага часу. А пакуль перад намі свет, убачаны вачыма нестандартнага чалавека. І ён не толькі апісвае, канстатуе факты, ён шукае, аналізуе, ён запрашае да роздуму іншых.**

*Святлана ТАРАСАВА,*
*кіраўнік літаб'яднання "Наднёманскія галасы",*
*старшы выкладчык кафедры*
*беларускай літаратуры.*

***Руслан КАЗЛОЎСКІ***

## ЁН

Чырвона-барвовыя колеры пераліваюцца паміж сабою, узаемна ўваходзячы і выходзячы адзін з другога. Дзесьці далей, пад небасхіл, ашматкі дзённых воблакаў глядзяць чорнымі тварамі незразумелых звышнатуральных звяроў. Але яны больш падобныя на цені з "нянашага" свету, які пра сваё існаванне заяўляе толькі падсвядомасці. Адчыняюцца дзверы вымярэнняў. Прыгожае аранжавае Святло раптам пачынае паглынаць усё гэта, Яно залівае сусвет, такое цёплае, прыемнае. Яно кліча тых, каму холадна тут. Яно асвятляе белым промнем сілы ўсіх, хто ўмее яго бачыць. Умець бачыць Гэта - стаць на новую прыступку, атрымаць магчымасць ісці па лесвіцы дабрамыснага жадання. Стаць часткай Гэтага - набыць несмяротнасць...

А ўнізе - горад, які тысячу гадоў стаіць пад промнямі начных зорак-сусветаў і Сонца. Шэра-чорныя колеры перамешваюцца з зялянінай раслiннага свету, надаючы ёй сталёвыя адценні. Тут - цішыня ў душах і шум тэхнікі. Цемра духу і весялосць фізічнага цела.

Змрок горада мяжуе з аранжовым Святлом. Мяжа настолькі моцная, што, падняўшы вочы з цемры, чорная душа слепне ад Яго. Трайная моц Яго асляпляе чужынца, але яна ж надзяляе сілай прагнучага, кліча ў сябе... Трэба вярнуцца назад, убачыць Святло, і шэры горад напоўніцца ім, і змаганне набудзе сэнс, і з'явіцца дабрамыснае жаданне. Дыхаць гэтым Святлом - жыць, стаць часцінкай Яго - атрымаць несмяротнасць. Аранжовае, белае, нябёснае - тры якасці ў розных вымярэннях, тое, што кліча дамоў. І я іду ТУДЫ!..

**1995**

## З НАЗІРАННЯЎ...

## 1992...

Сваяк прынёс даволі ладны кавалак вельмі нядрэннай каўбасы, якую мы, простыя нармальныя людзі, вельмі рэдка можам бачыць на прылаўках. Шмыгнуўшы носам і ўздыхнуўшы, выціснуў нарэшце выпакутаванае:

- Мы гэтую каўбасу не елі: не для нас яна. Але і начальства не ела, бо ім была лепшая. А гэтую жэрлі дробныя мафіёзі: прадаўцы крамаў, іх сваякі, знаёмыя...

**люты, 1992**

* * *

Адстаўны прапаршчык стаіць у натоўпе людзей на Кургане Славы ў Дзень Перамогі. Блікі сонца хораша зіхацяць на бліскучых юбілейных бляшанках "За безупречную службу", "20 лет Победы", "Пятьдесят лет вооруженным силам СССР" і г.д. Ён ганарліва трымае галаву. Сыты белы твар задаволены: усе на яго звяртаюць увагу, саступаюць месца. Невялікая купка піянераў уручыла кветкі і падзякавала за Перамогу...

У тым жа натоўпе стаяў шэраговы "афганец", на мыліцах, з сівой пасмай у валасах і цьмяным "За отвагу". Яму не пакланіўся ніхто...

**1989**

* * *

*"Хутчэй вярблюд пралезе ў вушка іголкі, чым багаты патрапіць у рай..."*

***Паводле Евангелля.***

"Я хачу "Мэрсэдэс"!" - Так нярэдка паўтарае мой знаёмы, катораму для поўнага шчасця не хапае толькі гэтага. Астатняе ён мае ўсё: і апошнюю мадэль "Жыгулей", і двухпавярховы асабісты на сябе аднаго (!) дом, і відык, і...

Перадача па БТ. На экране маленькі з падцёкамі вільгаці пакойчык. За старэнькім сталом у нейкім незразумелым крэсле, падобным на інвалідную каляску, сядзіць дзесяцігадовая дзяўчынка з бліскучым вясёлым позіркам дзіцячых вочак. Карэспандэнт падае ёй мікрафон і задае звычайнае дзіцячае пытанне: "Чаго б ты больш за ўсё хацела мець у сваім жыцці?" Дзяўчынка і яе агністыя вялікія вочы без імгнення роздуму тут жа адказалі: "Хачу хадзіць!"

**1991**

# НАШ ВЕРНІСАЖ

Сапраўднае свята душы стварае выстава студэнцкіх работ "Артсесія", якая адкрыта з 27 лютага ў гарадской выставачнай зале па вуліцы Ажэшкі. Тут прадстаўлены работы студэнтаў аддзялення мастацтваў кафедры педагогікі і псіхалогіі. Розныя жанры, розныя рашэнні. За кожнай карцінай - думкі мастака, яго светапогляд. Добрае ўражанне пакідаюць работы Л. Русак, А. Філіповіча, С. Юр'ева, А. Гук. Ды і наогул, усе карціны заслугоўваюць добрага слова.

Выстава мастакоў-студэнтаў - не першая. Крыху больш за год таму іх работы выстаўляліся ў галерэі Тызенгауза. Нашы мастакі ўдзельнічалі ў некалькіх рэспубліканскіх і міжнародных выставах. Побач з работамі, якія ўжо былі прадстаўлены на суд гледача, - зусім новыя, свежыя. Адчуваюцца творчы пошук, рост і шліфоўка майстэрства. "Артсесія" - яшчэ адзін упэўнены, трапны штрых да агульнага партрэта аддзялення мастацтваў. Больш падрабязны матэрыял з выставы - у наступным нумары газеты.

**ГРОДНЕНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМ. ЯНКИ КУПАЛЫ ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС НА ЗАМЕЩЕНИЕ ВАКАНТНЫХ ДОЛЖНОСТЕЙ:**

- доцента кафедры истории славянских государств;
- доцента кафедры математики и методики преподавания математики в начальной школе;
- 3-х старших преподавателей кафедры иностранного языка (английский язык);
- старшего преподавателя кафедры физического воспитания;
- старшего преподавателя кафедры теории и методики физической культуры;
- старшего преподавателя кафедры психологии;
- старшего преподавателя кафедры романских языков;
- преподавателя кафедры иностранного языка (французский язык);
- преподавателя кафедры иностранного языка (английский язык);
- 2-х преподавателей кафедры немецкого языка;
- преподавателя кафедры прикладной оптики (0,5 ставки);
- преподавателя кафедры теории и методики физической культуры;

Срок конкурса - 28.03 - 27.04. 1998 года.

**Документы по конкурсу направлять по адресу: 230023, ул. Ожешко, 22, университет. Ректору.**

# РЕСПУБЛИКАНСКАЯ АССОЦИАЦИЯ МЕЖДУНАРОДНЫХ МОЛОДЕЖНЫХ ОБМЕНОВ И ТУРИЗМА (РАММОТ)

**ОСНОВАНА В 1994 ГОДУ ПРИ УЧАСТИИ ОБЛАСТНЫХ КОМИТЕТОВ ПО ДЕЛАМ МОЛОДЕЖИ. РАММОТ ЯВЛЯЕТСЯ ЧЛЕНОМ МЕЖДУНАРОДНОЙ КОНФЕДЕРАЦИИ СТУДЕНЧЕСКИХ ОБМЕНОВ И ТУРИЗМА.**

**Основные цели РАММОТ**

1. Способствовать развитию духа взаимопонимания между молодежью мира путем создания широкой сети доступных туристических услуг.

2. Решение проблем адаптации молодежи на современном рынке труда.

В структуру РАММОТ входит Республиканский студенческий ISIC -совет, члены которого ведут работу по информированию и пропагандированию международного студенческого билета среди учащихся, по расширению системы льгот и скидок для ISIC владельцев.

**Деятельность РАММОТ**

Таким образом, исходя из основных целей, деятельность Ассоциации сконцентрирована на трех приоритетных направлениях.

**1. Комитет вторичной занятости учащихся и студенческой молодежи.** Основная задача: обеспечение студенческой молодежи возможностью вторичной занятости в летний и осенний периоды через систему стройотрядов.

**2. Комитет по распространению международных студенческих билетов ISIC.**

Комитет решает задачу: сделать международный обмен и туризм материально более доступным для молодежи Беларуси. Международный студенческий билет - реальная возможность решения этой задачи, так как, являясь международным удостоверением личности, он дает право своим обладателям возможность пользоваться широкой сетью льгот и скидок, гарантированных государством, более чем в 93 странах мира.

Кроме того, ведется активная работа по созданию аналогичной системы льгот и скидок для владельцев ISIC на территории Беларуси.

**3. Комитет международных отношений.**

Работа данного комитета строится в двух направлениях:

1. Работа с международными фондами

В 1997 году при поддержке Государственного комитета по делам молодежи Республики Беларусь подготовлена программа ТАСИС и подана на финансирование в комиссию ЛАЙН Европейского сообщества на тему: "Создание концепции производственной школы в качестве формы борьбы с молодежной безработицей в Беларуси".

2. Международные молодежные обмены, внешний и внутренний туризм.

***За дополнительной информацией обращаться к официальному представителю: г. Гродно, ул. Ожешко, 22, каб. 229, тел. 44-50-54, факс 44-84-61.***

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, П. БАЗЫЛЬЧЫК**
*Карэктура:* **Н.ДУДКО**

*Здадзена ў набор 22.03.98*
*Падпісана да друку: 31.03.98, 15.00*
*Заказ № 36*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 паасобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не утрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас: ✉ 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, п.228. ☎ 72-08-17.*